# Не змоўкнуць ніколі Купалавы словы

**У гэтым пераканаы навучэнцы і педагогі СШ №1, якая вось ужо 66 гадоў носіць імя Янкі Купалы.**

21 лютага, у Міжнародны дзень роднай мовы, тут прайшоў «Купала-ФЭСТ» — фінальнае мерапрыемства марафона «Люблю Купалу сэрцам», што доўжыўся цэлы год і прысвячаўся 140-годдзю з дня нараджэння Песняра.

Усе класы з першага па адзінаццаты кожны месяц актыўна ўдзельнічалі ў акцыях, фота- і арт-флэшмобах, фота- і відэачэленджах, квэстах, падрыхтаваных намеснікамі дырэктара Наталляй Пруднікавай, Наталляй Вяжэвіч, Наталляй Вяршыцкай. Адметна, што да іх далучыліся вучні іншых навучальных устаноў раёна. У школьным двары была закладзена алея Янкі Купалы, для вучнёўскага актыву арганізавана паездка ў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы.

Родную мову ў першай школе выкладаюць зацікаўленыя і вопытныя педагогі Алена Новік, Раіса Раманоўская, Інеса Ліс,



Удзельніцы клуба ЮНЕСКА «Планета» Насця Дубініна, Кіра Канарэйкіна, Марыя Мацко, Марыя Гнюсевіч правадзілі гульні.



Дырэктар школы Васілій Маліноўскі ўзнагародзіў пераможцаў конкурсаў.



«Мы любім беларускую мову і культуру, шануем традыцыі нашых продкаў», — гавораць Ульяна Рак і Дзяніс Шыман.



Ірына Лычкоўская, Іна Ціханёнак. У іх вучняў нямала перамог у алімпіядах, літаратурных конкурсах, конкурсах даследчых работ. Нельга не адзначыць дасягненні выпускніцы 2020 года Ксеніі Брыль, якая перамагла ў рэспубліканскай алімпіядзе па беларускай мове. Свой бліскучы вынік яна раздзяліла з настаўніцай Інесай Ліс, якая дапамагла ёй падрыхтавацца да алімпіяды. У 2021 годзе Станіслаў Іваноў пад кіраўніцтвам педагога Алены Новік атрымаў дыплом ІІІ ступені на абласным этапе конкурсу даследчых работ па літаратуразнаўстве.

«Купала-ФЭСТ» праходзіў не толькі на сцэне ў актавай зале. На ўсіх перапынках у розных лакацыях разгарнуліся выстаўкі, тэматычныя пляцоўкі, на якіх прапаноўваліся майстар-класы, гульні, віктарыны.

Старшыня школьнага вучэбна-метадычнага аб'яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры Алена Новік разам з юнымі памочнікамі праводзіла гульню "Знайдзі пару", якая давала ўяўленне аб прадметах побыту, адзенні беларусаў мінулых стагоддзяў. Алена Валер'еўна таксама нагадала, што ў школе даўно створаны пакой Янкі Купалы, у якім часта праводзяцца заняткі, квэсты, розныя цікавыя сустрэчы.

Дзяўчынкі з клуба ЮНЕСКА «Планета» цэнтра творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік» разам з кіраўніком Марынай Відміч праводзілі акцыю «Рускай мове дай разгрузку, гавары па-беларуску». Кіраўнік гуртка «Вытокі» Марыя Собаль запрашала на майстар-клас па саломапляценні, вучыла дзяцей ткаць беларускія паясы. Тэматычныя магніты прапанавалі набыць удзельнікі школьнай бізнес-кампаніі «Пазітыў». Удзельнікі танцавальнага калектыву «Серпанцін» заклікалі ўсіх жадаючых далучыцца да святочнага карагоду — вялікага кола шчасця школы.



**Кіраўнік гуртка «Вытокі» Марыя Собаль правяла майстар-клас па саломапляценні.**

Тым часам педагогі-арганізатары Лідзія Буйко, Марыя Рубацкая, педагогі дадатковай адукацыі Анастасія Рак і Юрый Рындзевіч, вядучыя Ульяна Рак і Браніслаў Купрыянаў запрасілі ўсіх у актавую залу на святочнае мерапрыемства. Дырэктар школы Васілій Маліноўскі павіншаваў вучняў і педагогаў з Міжнародным днём роднай мовы, уручыў дыпломы пераможцам конкурсаў і акцый, што праходзілі ў рамках марафона «Люблю Купалу сэрцам».

Першае месца ў акцыі «І вечнасць радка як вечнасць жыцця» ў вучняў 7 «А» класа. У фотафлэшмобе «Дзень Янкі Купалы» перамаглі Ксенія Школьнікава, Паліна Дурко (вучаніца Палачанскай СШ), Вікторыя Сасновіч. За ўдзел у акцыі «Купалаўскі радок» дыпломам І ступені ўзнагароджаны вучні 4 «А», 5 «В», 8 «А» класаў, у фотачэленджы «Што сэрцу міла» — 4 «Г», 5 «В» і 5 «Г», 9 «Б» класаў. За перамогу ў квэсце "Я адкрываю Купалу" дыплом І ступені атрымалі «Стас і яго каманда».




**Як называюцца старадаўнія прадметы побыту, даведаліся ў час гульні Міхаіл Гарыст і Ксенія Гарбачэўская.**

У гэты дзень у школе было шмат гасцей. Сваёй творчасцю радавалі ўдзельнікі гурту «Талака» дзіцячага цэнтра культуры «Расток», інструментальны ансамбль «Маладзечанскія дударыкі» СШ №14 пад кіраўніцтвам Сяргея Ярука, танцавальны калектыў «Купалінка» Радашковіцкай СШ пад кіраўніцтвам Жанны Жалінскай, вакальны ансамбль вучняў і педагогаў гімназіі №10. Прыемна, што ў родную школу прыехала лаўрэат рэспубліканскіх конкурсаў салістка ўзорна-паказальнага аркестра ўнутраных войск МУС Рэспублікі Беларусь Кацярына Паўловіч. Выдатна тэатралізавалі песню «Ехаў Ясь» удзельнікі вакальнага гурту «Чысты гук» СШ №1. Пранікнёна чытала верш Янкі Купалы «Малітва» Паліна Паслед. На пошукі запаветнай папараць-кветкі запрасілі юныя танцоры харэаграфічнага калектыву «Серпанцін».



**Гасцінныя гаспадыні Таццяна Барэйка і Алёна Посах запрашалі падсілкавацца стравамі беларускай нацыянальнай кухні.**

Вынікі марафона падведзены. Аднак мерапрыемствы, прысвечаныя Песняру, роднай мове, беларускім традыцыям і культуры, будуць працягвацца. Як адзначыў Васілій Маліноўскі, у бліжэйшых планах — адкрыццё мемарыяльнай дошкі і прэзентацыя алеі, прысвечанай 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы. А «Купала-ФЭСТ» стане традыцыйным мерапрыемствам школы ў Міжнародны дзень роднай мовы.

**Анжаліка КРУПЯНЬКОВА.**
**Фота: Аляксей ПЛАТКО.**